[1] Гл.: Полное собрание законов Российской империи. 1-е собр. (Далей ПСЗ-I). СПб., 1830. Т. 23. № 17 113.

[2] Гл.: К о я л о в и ч  М. О. История воссоединения западно-русских униатов старых времен. СПб., 1873. С. 353–355.

[3] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Вильно, 1889. Т. 16. С. 7–8.

[4] Гл.: Там жа.

[5] Гл.: Там жа.

[6] Р у н к е в и ч  С. История Минской архиепископии (1793–1832 гг.). СПб., 1893. С. 271.

[7] Гл.: Н и к о л ь с к и й  Н. М. История русской церкви. Мн.,1990. С. 288.

[8] Гл.: ПСЗ-I. Т. 23. № 17 345.

[9] Р у н к е в и ч  С. Указ. соч. С. 243.

[10] Гл.: К о я л о в и ч  М. О. История воссоединения... С. 368.

[11] ПСЗ-I. Т. 23. № 17 318; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). Ф. 136, воп. 1, спр. 542, арк. 6–13.

[12] Гл.: К о я л о в и ч  М. О. История воссоединения... С. 371.

[13] ПСЗ-I. Т. 23. № 17 384; 17 391.

[14] К о я л о в и ч  М. О. История воссоединения... С. 371.

[15] НГАБ. Ф. 136, воп. 1, спр. 571, арк. 35; ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 46.

[16] Гл.: Там жа. Ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 33 адв., 34–36, 41, 42.

[17] Гл.: Там жа. Ф. 136, воп. 1, спр. 571, арк. 8–68; ф. 295, воп.1, спр. 2, арк. 27 адв., 28, 31, 31.

[18] Там жа. Ф. 295, воп. 1, спр. 2, арк. 43.

[19] Гл.: Там жа. Арк. 39, 40, 46, 49.

[20] Там жа. Арк. 33 адв.

[21] Там жа. Арк. 51 адв.

[22] К о я л о в и ч  М. О. Чтения по истории Западной России. СПб., 1884. С. 306–307.

[23] Гл.: Р у н к е в и ч  С. Указ. соч. С. 263, 403.

[24] Гл.: К и п р и а н о в и ч  Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до настоящего времени. Вильно, 1885. С. 168.

[25] Н и к о л ь с к и й  Н. М. Указ. соч. С. 289.

*К.А. РЭВЯКА*

## ВЫКАРЫСТАННЕ СЛАНОЎ У ГАНІБАЛАВАЙ ВАЙНЕ (218–201 гг. да н. э.)
### (ПА СВЕДЧАННЯХ ГРЭКА-РЫМСКІХ АЎТАРАЎ)

Прыручаных, адамашненых і выдрэсіраваных магутных сланоў у старажытнасці выкарыстоўвалі ў многіх войнах. Аб гэтым сведчаць шматлікія грэчаскія і рымскія аўтары: Палібій, Лівій, Апіян, Дыядор, Флор і іншыя даследчыкі антычнасці – А. Неміроўскі, І. Кавалёў, Т. Момзен, А. Тойнбі і інш. Вучоныя XX ст. назвалі сланоў – магутную зброю старажытнасці – “антычнымі танкамі”. Шырока выкарыстоўвалі іх у войнах карфагенскі палкаводзец Ганібал і яго бацька Газдрубал. Ганібал, будучы ў Іберыі (Іспанія), наводзіў сланамі жах на мясцовых жыхароў, а ў хуткім часе пакарыў іх (Лів., XXI, 5, 10)[1]. Ганібал з дапамогай сланоў разбурыў саюзны рымлянам горад Сагунт у Іспаніі, перайшоў раку Эбра і, сеючы раздоры паміж плямёнамі, пазбавіў іх адзінства ў барацьбе з пунійцамі (карфагенянамі). Так, у паходзе на Рым пры пераправе праз раку Эбро, па словах Лівія (XXI, 5, 15), “многіх патапіла рака; другіх цячэнне занесла да непрыяцеля, дзе іх раздавілі сланы”. Так сланы дапамаглі не толькі пры пераправе Эбро, але і апустошылі палі, і на працягу некалькіх дзён карфагеняне падпарадкавалі племя карпетанаў у Іспаніі (Лів., XXI, 5, 16).

Разбурыўшы непакорны саюзны рымлянам г. Сагунт, Ганібал, рыхтуючыся ў паход на Рым, умацоўваў тыл. Пакідаючы Іспанію, ён назначыў свайго брата Газдрубала з арміяй і сланамі яе намеснікам (Лів., XXI, 22, 3). На шляху да Італіі армія Ганібала дайшла да ракі Радан (Рона), праз якую неабходна было пераправіць жывёл-веліканаў. “Сланы заўчасна усе былі сабраны на беразе; затым самы сярдзіты з іх, прыведзены ў ярасць сваім праважатым, кінуўся за ім. Праважаты ўбег у ваду, слон рушыў за ім туды і сваім прыкладам уцягнуў усё стада ў раку; а калі жывёлы дайшлі да глыбокіх мясцін і згубілі брод, то само цячэнне ракі аднесла іх да другога берага”. Ёсць і другое сведчанне Лівія (XXI, 28, 5–12) пра тое, што сланы былі перапраўлены на другі бераг на плытах, пакрытых зямлёю. Сланы ў паходзе



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

ішлі з конніцай, а сам палкаводзец з лепшымі атрадамі пяхоты замыкаў шэсце (Лів., XXI, 34, 5).

Армія Ганібала дайшла да Альпаў. Горцы, якія ніколі не бачылі сланоў, даволі варожа сустрэлі воінаў: нападалі на іх з мэтай рабаўніцтва. Сланы ж запавольвалі шэсце ў гарах, асабліва ў тых месцах, дзе іх прыходзілася весці па вузкіх крутых дарогах, "але затое яны ствaралі бяспечнасць той частцы войска, у якой ішлі, так як ворагі, ніколі не бачыўшыя гэтых жывёл, баяліся падыходзіць да іх блізка" (XXI, 35, 3).

Вузкія горныя сцежкі пераадольваліся з вялікімі цяжкасцямі, а ў некаторых мясцінах велічныя скалы наглуха загароджвалі шлях. Лівій (XXI, 37) дае апісанне такіх мясцін. Рымляне "запалілі вялікае вогнішча, а потым, калі яно выгарала, залілі раскалены камень воцатам. Аб такім спосабе разбурэння скал пры дапамозе воцату гаворыць і Пліній Старэйшы ў "Натуральнай гісторыі" (XXIII, I, 57)[2]. Жалезнымі кіркамі і лапатамі яны разломлівалі патрэскаўшуюся ад сілы агню скалу і рабілі праходнай дарогу, па якой маглі спусціцца не толькі гружаныя абозныя жывёлы, але і сланы (Лів., XXi, 37, 3). Чатыры дні былі страчаны на разбурэнне скалы. За гэты час узнікпа пагроза для жывёлы, якая магла загінуць ад голаду. Прайшоўшы ў даліну, "коней пусцілі пасвіцца, а стаміўшымся людзям быў дадзены адпачынак" (Лів., XXI, 37, 6). Так Ганібал здзейсніў пераход з Іберыі (Іспаніі) ад Новага Карфагена да падножжа Альпаў за пяць месяцаў, а на пераадольванне Альпаў – 15 дзён (Лів., XXI, 38, 1). У яго да пераходу было 100 тыс. пяхоты і 20 тыс. конніцы (Лів., XXI, 38, 2; Паліб., III, 56, 43), а засталося пасля пераходу толькі 20 тыс. пяхоты, 9 тыс. конніцы і некалькі баявых сланоў. Змучаныя, галодныя, знясіленыя воіны Ганібала раскінулі свой лагер на раўніне (Паліб., III, 50–56[3]; Лів., XXI, 32–37; Ароз., IV, 14, 3–4[4]). Момзен правільна заўважыў, што "калі б рымляне паставілі дзе-небудзь недалёка ад Турына, а яны гэта маглі зрабіць, корпус з 30 тыс. нязмучаных і гатовых да бою салдат і калі б яны адразу прымусілі ворага прыняць бой, то вялікія задумы Ганібала наўрад ці мелі б поспех"[5]. Але рымлян не было там, дзе ім неабходна было б быць, і яны не парушылі такі неабходны для варожай арміі адпачынак.

Знясіленыя людзі і жывёлы (коні, сланы, вярблюды) павінны былі ваяваць з рымлянамі. Гледзячы на ўсё гэта, Ганібал сказаў, што больш за ўсё яго хвалюе неабходнасць жорсткага змагання, а можа ўзнікнуць думка, быццам бы Ганібала перамаглі Альпы (Лів., XXI, 40, 10). Першая сустрэча Ганібала з рымлянамі адбылася ў баі пры рацэ Ціцын, дзе геройскі праявіў сябе Публій Карнэлій Сцыпіён Афрыканскі, будучы пераможца Ганібала (Паліб., X, 3, 4; Лів., XXI, 46, 5–9), але на даным этапе першае пабоішча даказала, што пунійская конніца пераўзыходзіць рымскую і, зыходзячы з гэтага, пабоішча на адкрытых палях для рымлян небяспечна (Лів., XXI, 47, 1). Сланы Ганібала з конніцай і пяхотай фарсіравалі раку, а астатняе войска перайшло ўброд. Пераправа была аблегчана тым, што пры гэтым сланоў паставілі ў адзін рад, каб аслабіць напор ракі (Лів., XXI, 47, 4).

Ганібал, атрымаўшы першую перамогу пры Ціцыне, адкрыў шлях далей па Італіі ў прадгор'ях Альпаў да ракі Трэбіі. Зусім непрадбачана рымляне папалі ў засаду, "дзе сланы напіралі ужо на сярэдзіну пярэдняй лініі рымлян, а палкаводзец Ганібала Магон нечакана з засады прывёў у такое замяшанне рымлян, што яны не маглі адбіць націск сланоў. І ўсё ж такі, як паведамляе Лівій (XXI, 55, 10), рымляне з усіх бакоў некаторы час паспяхова адбівалі сланоў, а "лёгкія пехацінцы закідалі іх дроцікамі і заставілі ўцячы, а потым, праследуючы бягучых сланоў, калолі іх пад хвост, дзе скура тонкая, і таму раніць іх было лягчэй". Раз'юшаныя сланы пачалі кідацца на сваіх воінаў. Ганібал прыказаў адвесці іх з сярэдзіны на левы край, дзе знаходзіліся дапаможныя атрады галаў, якія адразу кінуліся ў бегства, а рымляне выратаваліся толькі тым, што дабеглі ў сваю калонію Плацэнцыю.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Лівій (XXI, 56. 6; 58, 11) адзначае, што "у карфагенян непагадзь і невыносныя халады загубілі многа людзей, уючных жывёлін і амаль усіх сланоу". Аб гэтым паведамляюць таксама Палібій (III, 74) і Апіян (Ганіб., 7, 28)[6]. Пунійцы у хуткім часе занялі Плацэнцыю і на працягу двух дзён заставаліся у засадзе на гэтым месцы. Сланы як асноуная вайсковая сіла Ганібала былі страчаны ім пры пераходзе лраз Альпы, пазней Апеніны і багністыя балоты Тразіменскага возера. Як паведамляе Палібій (III, 74, 10), "Ганібал ехау на адзіным уцалеушым слане, які узвышауся над вадой; галава у палкаводца была цяжкай ад недасыпання, начной сырасці і балотнага паветра. Лячыцца не было ні месца, ні часу, і ён аслеп на адно вока", правае (Лів., XXII, 2, 11; Карн., Неп., Ганіб., 4, 3)[7].

Згодна Палібію (III, 74, 10), загінулі усе сланы Ганібала, акрамя аднаго. Па Лівію (XXI, 58, 11), сем уцалеушых сланоу загінулі пасля зімоукі пры пераправе праз Апеніны. З іспаніі Ганібал прывёу 37 сланоу (Еутроп., III, 8, 2). Застаушыся без адзінага слана, палкаводзец страціу моцны козыр у барацьбе з рымлянамі. Але у Карфагене вырашылі аказаць дапамогу Ганібалу. Лівій (XXIII, 13, 7) адзначае, што "у сенаце амаль адзінадушна пастанавілі папоуніць войска Ганібала у колькасці 4 тыс. нумідзійцау, 40 сланоу і 1 тыс. талантау срэбра".

Ганібал шырока выкарыстоувау сланоу пры аблозе гарадоу, наводзячы жах на жыхароу. "Так, ён аднойчы адрэзау ад горада Казіліна жыхароу, якія выйшлі з горада і спрабавалі праврацца: пусціу на іх сланоу і загнау перапалоханых назад у горад. Забітых было многа..." (Лів., XXIII, 13, 7). Лівій працягвае, што, мабыць, гэта былі тыя сланы, якіх толькі што прыслалі у Італію Ганібалу па рашэнню карфагенскага сената.

Пунійскія сланы у барацьбе з рымлянамі сталі важнай зброяй. Аб гэтым зазначае і Лівій (XXIII, 29, 14), што, "гонячы з сабою сланоу, пунійцы баяліся, каб не пакінуць такую важную зброю праціуніку". Так, брат Ганібала Магон, адпрауляючыся у іберыю (іспанію), рыхтавауся адправіць у італію 12 тыс. пехацінцау, паутары тысячы коннікау і 20 сланоу (Лів., XXIII, 32, 5). Абставіны заставілі Магона накіравацца спачатку у італію, таму што амаль уся Іберыя была у рымскіх палкаводцау. Так, у хуткім часе на дапамогу брату Ганібалу к гораду Нола "прыйшоу з Бруцція Ганон з падмацаваннем з Карфагена і са сланамі" (Лів., XXIII, 43, 6). І усё ж такі рымляне пры Ноле атрымалі першую перамогу над Ганібалам (Лів., XXIII, 46, 2–4): "У гэты дзень было перабіта 5 тыс. ворагау, у палон узята 600, захоплена 19 штандарау і два сланы, а чатыры сланы былі забіты у баі; рымлян было забіта менш тысячы".

Поспех быу у рымлян і у іберыі (Іспаніі). Па сведчаннях Лівія (XXIII, 49, 11), у 215 г. да н. э. там жа рымляне перабілі ворагау больш, чым было саміх рымлян, а у палон узята звыш трох тысяч, штандарау – 59, коней – каля тысячы і 7 сланоу, а 5 сланоу былі забіты у час бітвы. У хуткім часе, летам 215 г. да н. э., у адным з пабоішчау "...ворагау было забіта болей 13 тыс. чалавек і у палон узята больш двух тысяч, а таксама 49 сланоу і два штандары" (Лів., XXIII, 49, 13). Пасля такіх падзей амаль усе народы іспаніі перайшлі да рымлян.

Амаль усе ваенныя аперацыі карфагенян на усіх франтах праходзілі з прыцягненнем сланоу. У іспаніі у Мунды (паблізу Кардовы) было забіта 39 гэтых жывёл. (Лів., XXIV, 42, 1–3). Сланы удзельнічалі і у баях за Сіцылію. У пунійскага палкаводца Гімількона, які высадзіуся у Гераклеі Мінойскай (паудне́вы бераг Сіцыліі), было 25 тыс. пяхоты, 3 тыс. коннікау і 12 сланоу (Лів., XXIV, 35, 3). Тут жа у баях за горад Агрыгент, акрамя воінау, загінулі 8 сланоу (Лів., XXV, 41, 7).

У маршы Ганібала па Кампаніі ішлі 33 сланы (Лів., XXVI, 5, 3). Рымскі консул Фульвій з арміяй і трыма сланамі дайшоу да самага вала Капуі і прарвау пунійскую лінію абароны. Рымляне з адчаем вялі бой перад валам



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Капуі і забілі сланоў, якія ўзбіраліся на вал. Забітымі сланамі завалілі роў і жорсткае пабоішча зноў прадаўжалася (Лів., XXVI, 6, 1–3). У рымскі лагер раптоўна ўварваліся іспанцы і нумідзійцы са сланамі, якія з шумам разбурылі палаткі, патапталі мулаў, разагналі коней, і пачалася вялікая суматоха (Лів., XXVI, 8–9). І усё ж такі ў ваенных дзеяннях на Сіцыліі былі значныя поспехі рымлян, якія ўзрадавалі іх. Лівій (XXVI, 21, 9) піша, што Марцэл нават справіў трыумф на Альбанскай гары, а потым з авацыяй увайшоў у горад з багацейшай дабычай. У гонар перамогі над карфагенянамі вялі 8 сланоў, а удзельнікі шэсця ішлі ў залатых вянках.

Вайна прадаўжалася. Ганібал сустрэўся ў бойцы з рымлянінам Марцэлам пры Герданеі і Канузіі. У гэтых баях сланы, раз'юшаныя дроцікамі, кінуліся на сваіх воінаў і забілі больш, чым ворагаў. Па сведчаннях Лівія (XXVII, 14, 14), загінулі каля 8 тыс. воінаў і 5 сланоў. Гэтая перамога каштавала рымлянам вельмі дорага: загінулі 1800 легіянераў і больш за 1300 саюзнікаў. Пасля гэтага Ганібал рушыў на поўдзень Італіі, у вобласць бруціяў.

У гэты час брат Ганібала Газдрубал у Іспаніі пры Бекуле даволі паспяхова вёў ваенныя аперацыі з прымяненнем сланоў. Лівій (XXVII, 18, 20) і Палібій (X, 39, 7) паведамляюць, што "...спалоханыя і раз'юшаныя сланы кінуліся на ворага. Перабіта было каля 8 тыс. чалавек". Пасля гэтых падзей Газдрубал ідзе на Італію з падмогай брату Ганібалу тым жа шляхам праз Альпы. Да прыходу ў Італію Газдрубала рымляне паспяхова вялі вайну з Ганібалам у Луканіі. Лівій (XXVII, 42, 7) сведчыць, што рымляне ўзялі ў палон больш за 700 чалавек, 8 тыс. было забіта, 9 штандараў узята, 4 сланы забіты, а 2 захоплены ў палон. Ваенныя дзеянні ў Ганібалавай вайне падыходзілі да заканчэння, але наперадзе чакалася вырашальнае пабоішча пры рацэ Метаўр у Італіі (Умбрыя). У гэтай вобласці брат Ганібала Газдрубал спадзяваўся аб'яднацца з арміяй Ганібала і разграміць ненавісны Рым. Але лёс распарадзіўся інакш. Рымляне, перахваціўшы планы Газдрубала, адпраўленыя ім пасланцамі, прымусілі яго прыняць бой. У гэтай вырашальнай бітве ўдзельнічалі і сланы (Лів., XXVI, 48, 5–7). Па сведчаннях Апіяна (Ганіб., 52), іх было 15. Лівій (XXVII, 48, 9; 49, 1–2), апісваючы пабоішча, распавядае, што "пры першым націску сланы змяшалі пярэднія рады рымлян і заставілі іх адступіць... Бой разгараўся, узмацніліся крыкі, і ўжо нельга было ўпраўляць сланамі, яны кідаліся паміж рымскімі і карфагенскімі войскамі, як бы не разумеючы, чые ж яны. У выніку "большасць сланоў перабілі не ворагі, а самі ж важакі. У кожнага з іх былі долата і малаток; калі сланы прыходзілі ў ярасць і пачыналі кідацца на сваіх, важак паміж вушэй ставіў долата і біў па яму з усіх сіл. Гэта самы хуткі спосаб умярцвіць велічнага звера, калі з ім ужо няма ладу. Газдрубал першым выкарыстаў гэта на справе..." (Лів., XXVII, 49, 2). На ўсім працягу Ганібалавай вайны шырока прымяняліся сланы, якія, як і воіны, гінулі ў пабоішчах. Лівій (XXX, 6, 9) апісвае і такі выпадак: рымляне падпалілі лагер карфагенян, у якім згарэлі 8 сланоў, а захоплены ў палон 6 сланоў.

Напрыканцы Ганібалавай вайны рымляне ў баях з карфагенскім палкаводцам Магонам многа разоў сустракаліся з магутнай зброяй – сланамі (Лів., XXX, 6; 18, 10; 18, 15). У барацьбе рымлян з пунійцам Магонам, братам Ганібала, загінулі 22 знакамітых рымскіх коннікаў, якія разам з некалькімі цэнтурыёнамі былі растаптаны сланамі (Лів., XXX, 15). І ўсё ж такі рымляне перамаглі толькі таму, што быў цяжка паранены пунійскі палкаводзец Магон. У апошніх баях Ганібалавай вайны на тэрыторыі Афрыкі рымскі палкаводзец Сцыпіён Афрыканскі вымушаны быў унесці змены ў размяшчэнне сваіх воінаў, улічваючы сланоў пунійцаў. Лівій (XXX, 33, 1–5) адзначае, што ў бітве пры Заме кагорты Сцыпіёна былі выстаўлены не ў адну суцэльную лінію, але так, каб паміж маніпуламі заставаліся шырокія прамежкі, па якіх пунійскія сланы маглі прайсці, не парушаючы баявога парадку. У пераходах



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

паміж маніпуламі ён паставіў капейшчыкаў, якія пры нападзенні сланоў павінны былі схавацца за радамі воінаў альбо разбегчыся направа ці налева, ачысціўшы сланам дарогу, дзе яны пападуць пад дроцікі з двух бакоў. Так Ганібал разлічваў узмацніць страх, паставіўшы ўперадзе сланоў, якіх было 80. Раней ён ніколі не выводзіў такую колькасць сланоў у бой (Лів., XXX, 33, 4). За сланамі былі дапаможныя атрады лігураў, галаў і іншых воінаў.

Нечаканага з боку рымлян раздаліся гукі труб і ражкоў, падняўся незвычайны крык, ад якога сланы павярнулі на сваіх – на маўраў і нумідаў, якія не вытрымалі. Саюзнік рымлян Масініса дабавіў ім страху, пазбавіўшы варожы фланг падтрымкі кавалерыяй. "Некалькі сланоў удалося пагнаць на ворага. Ідучы скрозь капейшчыкаў, параненыя, яны разбуралі ўсё навокал. Капейшчыкі адскоквалі к маніпулам, каб не быць растаптанымі, далі дарогу сланам і з абодвух бакоў перадавой кідалі ў іх свае дзіды і дроцікі. Сланы павярнулі на сваіх, і тыя вымушаны былі уцякаць разам з коннікамі, якія сталі на правым флангу (Лів., XXX, 33, 14–16). Рымляне пераўзыходзілі ворага колькасцю і ўпэўненасцю ў сабе, адзначае Лівій (XXX, 34, 13). Яны прымусілі ўцякаць карфагенскую конніцу і сланоў, пацяснілі перадавую і змагаліся на другой лініі. У апошнім пабоішчы пры Заме пераможцы-рымляне захапілі 132 штандары, 11 сланоў; загінулі 20 тыс. карфагенскіх воінаў. Рымляне страцілі каля паўтары тысячы воінаў (Лів., XXX, 35, 3).

Яшчэ ў старажытнасці знаўцы ваеннага мастацтва высока ацанілі заслугі карфагенскага палкаводца Ганібала за яго выключнае майстэрства арганізацыі наступлення і абароны. І ўсё ж такі не ваеннае майстэрства Ганібала і не яго незвычайная зброя (сланы) у вайне вызначалі пераможцу. Перамог Рым і яго сацыяльна-эканамічная і палітычная сістэма, якую ўзначальваў палкаводзец Сцыпіён, атрымаўшы за перамогу ганаровы тытул "Афрыканскі". Сцыпіён Афрыканскі ад імя Рыма і прадыктаваў Карфагену першапачатковыя ўмовы міру, пры заключэнні якога ў пратаколах (Лів., XXX, 37, 3; 43, 11) была запісана адна з галоўных умоў: карфагеняне "аддадуць прыручаных сланоў і прыручаць больш іх не будуць". Большую колькасць гэтых сланоў паслалі ў Рым, дзе яны былі выкарыстаны ў грамадскіх відовішчах і ў вайне з Македоніяй (Лів., XXX, 36, 4). Частку сланоў рымляне аддалі свайму саюзніку ў Афрыцы Масінісу.

Незвычайную і магутную зброю старажытнай гісторыі – сланоў, якіх вучоныя называюць "антычнымі танкамі", – рымляне ўпершыню ўбачылі ў войнах з Карфагенам.

[1] Ливий Т. История Рима от основания Города: В 3-х т. М., 1991. Т. 2. (Тут і далей у дужках спасылкі на указ. творы. Пер. аутара. – К.Р.)

[2] Плиний Старший. Естествознание. Об искусстве / Пер. с лат. Г.А. Тароняна. М., 1994

[3] Полибий. Всеобщая история в сорока книгах: В 3-х т. / Пер. с греч. Ф.Г. Мищенко. М., 1995. Т. 1.

[4] Orosius P. // Historiarum adversus Paganos Libri. Lipsiae, 1889.

[5] Моммзен Т. История Рима. М., 1936. Т. 1. С. 542.

[6] Аппиан. Римские войны / Пер. под ред. С.А. Жебелева. СПб., 1994.

[7] Корнелий Непот. О знаменитых иноземных полководцах / Пер. с лат. и коммент. Н.Н. Трухиной. М., 1992.

[8] Евтропий. Краткая история от основания Города. М., 1997.

*А.А. ЛЕВШЕВИЧ*

## РУМЫНО-ФРАНЦУЗСКИЕ КУЛЬТУРНЫЕ СВЯЗИ (1829–1845 гг.)

Важной составной частью румыно-французских отношений периода 1829–1845 гг. являются культурные связи между народами Дунайских княжеств и Францией. Без их рассмотрения история взаимоотношений между государствами и народами не может быть выяснена всесторонне. Их развитие не могло не оказывать влияния на формирование общественного мне-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm